мае да гэтага жаданьне а волю, то й можа быць пэўны свайго вывальненьня.

Мова народу ё складанаю й вялікаю колькасна зьяваю. Тое, што кажны дастаець ад бацькоў сваіх — гэта толькі малая частка мовы народу ягонага. Затым і роднае мовы надабе вучыцца. Дзеці, моладзеж вольных народаў вучацца роднае мовы ў школах пачатных і сярэдніх, а некаторыя й на ўнівэрсытэтах. Вялікалітва паняволена, варагі яе забаранілі школы вялікалітоўскія. Тое веданьне й знацьцё роднае мовы, што людзі незалежных народаў адзержуюць у сваіх школах, Вялікаліцьвіны прысілены прыдбаваць саматугам. Затым асаблівая рупнасьць мае быць дзеля гэтага прыдбаньня. Нашая мова ў сваім краю із школ і адусюль аддалена, яе там Маскалі перасьлядуюць, і мянуюць нашы варагі яе адно дзеля таго, каб яе хвальшаваць. Затым Вялікаліцьвіны маюць атачыць сваю мову вялікаю ўвагаю, маюць ня толькі яе шанаваць а важыць, але й паважаць. Каб жа гэта маглі чыніць, маюць наўперад яе — знаць! Да гэтага й будзе служыць „Веда“.

Гістора ё вучыцелкаю жыцьця. Гэта ведалі ўжо старавечныя Рымляне. Каб жа ў яе вучыцца, надабе яе пазнаць, казаў тый, зь ёю пазнаёміцца.

Гістора народу вялікалітоўскага надзвычайна багатая. Радкое месца ў Вялікалітве ня мае гістарычнага значаньня. Але, як мы былі паняволеныя, пісалі гістору нашу галоўна тыя, што, губячы нас, загубілі гаспадарства наша, славутае Вялікае Княства Літоўскае. Каб мацней дзяржаць нас у сваёй няволі, яны ў сваіх пісанях болей хвальшавалі ведамкі праз гістарычныя падзеі ў нашым краю, чымся казалі празь іх праўду. Цяпер жа камуністычна–чарнасоценная Масква давяла сваё хвальшаваньне гісторы нашае да найвышшае бодкі. Разам із тым Масква сыстэматычна нішча нашы гістарычныя памяткі.

# Археолёґам вялікалітоўскім Масква забараніла азначаць век і этнос археолёґічных памятак

У кнізе „Древности Белоруссии“, выданай у Менску 1966 г., на бач. 330 кажацца: „Сэкца каменнага а бранзовага веку адцяміла, што шырокія проблемы, у васобнасьці хронолёґіі й этносу, ня могуць быць разьвязаны супрацаўнямі сэктору Беларусі, але вымагаюць супольных сілаваньняў з археолёґамі зьвязавых інстытутаў“.

Не абмылы Масква баіцца, бо абмылу можна паправіць, і будзе брыдка тым, што абмыліліся; але як скажуць праўду, і яна пашырыцца, тады хвальшаваць яе будзе цяжка.

# Ацец, Дохтар Віктар Войтанка–Васілеўскі

**(Прамова на Дзядох па ім 29 красавіка 1972 г.)**

Сьв. памяці Сьвятар Дохтар Віктар Войтанка–Васілеўскі належыў да тых дзеяньнікаў вялікалітоўскіх, што ўсюдых і заўсёды, пры ўсялякіх умовах працуюць дзеля справы народу свайго. Ужо за гэта належа Яму вялікая павага.

Будучы такім, Ён маў ініцыятыву, адгукаўся на ўсі патрэбы нашыя, не ўзаляжняў свае нацанальнае працы, дзеяльнасьці ад тога, якімі былі іншыя, добрыя ці благія. Ён ведаў, што справа вялікалітоўская (беларуская) ё справаю ўсіх і кажнага Вялікаліцьвіна–Беларуса. Затым кажны мае працаваць дзеля яе, дзеля народу свайго, не азіраючыся на іншых.

Як вымагаў наш вялікі родзіч, Адам Міцкевіч, Віктар Войтанка–Васілеўскі мераў сяродкі на замеры, не замер подле сяродкаў. Гэтак усі маюць рабіць, бо, чакаючы сяродкаў,